

# ЯКУБ РАМАНАВІЧ БРАЙЦАЎ: СУСТРЭЧА З ЗАБЫТЫМ ПІСЬМЕННІКАМ

У **Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ)** увагу даследчыкаў прыцягвае адзін з яго першых фондаў – **фонд № 7** пісьменніка канца XIX – пачатку XX ст. **Якуба Раманавіча Брайцава**. Унікальнасць фонда ў тым, што творчасць пісьменніка, чыё імя ўвайшло ў многія беларускія даведнікі і энцыклапедыі, зусім невядома шырокаму чытачу: добра захаваная ў рукапісах яго літаратурная спадчына амаль не друкавалася. Пры жыцці Якуба Брайцава ўбачыў свет у **1889 г.** у маскоўскім выдавецтве **І.М. Кушнярова** толькі адзін яго твор – **аповесць "Богачи"**, выданне, якое сёння з’яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю.



*Якуб Брайцаў. Фота 1920-х гг.*

**Асабісты фонд Якуба Брайцава** складае ўсяго **дваццаць сем спраў за 1884 – 1948 гг.** Паступіў ён у БДАМЛМ у **1961 г.** ад сына пісьменніка **В.Я. Брайцава**[1] і захоўвае рукапісы празаічных твораў Я. Брайцава: **рамана "Паміж балот і лясоў", аповесцяў "Няўдашачка Анюта", "Багацеі", "Гаспадар", апавядання "Дудалёва лаза", псіхалагічнага эцюда "Юда", камедыі "Бяда цыгана",**



БОГАЧИ

повѣсть

изъ бѣлорусской простонародной

жизни.

Я. Р. Брайцева.

МОСКВА.

1889.

*Аповесць "Багацеі". 1899 г.*



*Маці Я. Брайцава.*
*Фота 2-й паловы XIX ст.*

**а таксама – верша "Дудка"; рэдкія біяграфічныя дакументы пісьменніка; каштоўныя фотаздымкі:** Я. Брайцава, яго маці, братоў, сястры, жонкі, сыноў – Дзмітрыя, Івана, Георгія, Васіля, а таксама ўнукаў і праўнукаў пісьменніка. Завяршае вопіс выдатны нарыс **Ф.М. Дамінікоўскага**[2] **"Белоруссия в произведениях Я.Р. Брайцева"**, які раскрывае нам невядомыя старонкі біяграфіі літаратара і аналізуе яго творчасць.

Дакументы фонда выяўляюць выдатную постаць пісьменніка Я. Брайцава, чалавека неардынарнага, разумнага, энэргічнага, рашучага, нават авантурнага, які ставіў высокія мэты ў розных накірунках дзейнасці і здзяйсняў іх, нягледзячы на неспрыяльныя жыццёвыя абставіны.

Якуб Брайцаў нарадзіўся ў **вёсцы Забялышын Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні** (цяпер – **Хоцімскі раён) 19 лютага 1861 г.** (заўважым – у дзень адмены прыгоннага права) у сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы, потым **Клімавіцкае павятовае вучылішча**. Вучыўся выдатна, захапляўся творамі рускіх паэтаў А. Пушкіна, М. Лермантава, А. Кальцова, М. Някрасава, ведаў шмат вершаў напамяць. Працаваў – спачатку памочнікам пісара ў Забялышынскім валасным праўленні, потым канторшчыкам на цукровым заводзе на Украіне. Бацька, чалавек жорсткі і дэспатычны, марыў бачыць старэйшага сына гаспадаром на зямлі. Але яго, як і двух другіх сыноў, вабілі навука, літаратура, вялікі горад, у якім можна было б пазбегнуць залішняй апекі бацькі, рэалізаваць свае творчыя магчымасці. На пачатку 1880-ых гг. дваццацігадовы Якуб Брай-

цаў пакідае родную вёску і накіроўваецца ў **Маскву**. Гэты эпізод яго жыцця звязаны з вельмі рамантычнай гісторыяй. Як напісаў Ф.М. Дамінікоўскі, *"по собственной инициативе и наперекор отцу поехал искать счастья в Москву в 1881 г. Уехал разом с невестой – фельдшерицей местной больницы. В пути, на почтовой станции Звенчатка (ныне в Климовичском районе на шоссе Кричев – Рославль) состоялась их свадьба"*[1, с.3].

У Маскве маладыя сужонкі з правінцыі, якія не мелі ні свайго вугла, ні грошай, ні знаёмых, усё ж не разгубіліся. Брайцаў нейкім чынам знайшоў працу сезоннага рабочага ў канторы вядомага кветкавода – прамысловіка **Фёдара Ноева**, уладальніка лепшых кветкавых крамаў горада. Добрасумленны і працавіты Якуб хутка атрымлівае ў яго пасаду бухгалтара. У вольны ад працы час наведвае **Румянцаўскую бібліятэку**, дзе чытае шмат кніг. Магчыма, у гэты час ён атрымлівае юрыдычную адукацыю, якая ў будучым стане яго вялікай падтрымкай. На вялікі жаль, гэта нельга пацвердзіць дакументамі. Уражанні дзяцінства і юнацтва, успаміны пра жыццё роднай вёскі самі сабой просяцца на паперу. У **1884 г.** Брайцаў піша свой першы твор – апавяданне **"Дудалёва лаза"**, а ў **1889 г.** сваім коштам выдае **"Богачи. Повесть из белорусской простонародной жизни"**. Побыт і людзі роднай Клімаўшчыны пазнаюцца ў аповесцях **"Няўдашачка Анюта"** і **"Старая вёска"**. Піша на рускай мове, але ў дыялогах герояў, апісанні мясцовых легенд і паданняў шыро-



*Жонка Я. Брайцава Праскоўя Сяргееўна (1865–1902), народжаная Кілесава, па прафесіі фельчар – акушэр. Масква. 1886 г.*

ка выкарыстоўвае беларускую лексіку (*"хвароба", "бульба", "сведка", "зайздрасць", "дробны", "ланцуг", "страха", "слончык"* і г. д.). Аповесць "Богачи" **Яўхім Карскі** назваў *"таленавітай"*, адзначыўшы ў аўтара *"тонкае веданне беларускай вёскі з усімі яе адмоўнымі бакамі"* (2, с. 143). **Максім Гарэцкі** ўключыў урывак з аповесці ў сваю **"Хрэстаматыю беларускай літаратуры"**, высока цэнячы значэнне гэтага твора: *"У канцы 80-х гадоў 19-га веку з'явілася прыкметнае ажыўленне беларускай думкі. З аднаго боку, пісьменнікі з каталіцка-панскай сферы, як Тапчэўскі, Абуховіч, А. Ельскі і інш., чуючы, як патроху слабне мёртвая пятля, накінутая Мураўёвым, пачалі хоць рукапісным спосабам, дык болей і болей урабляць беларускі грунт, створаны Марцінкевічам, і рыхтаваць яго для натуральнай перадачы ў рукі людзей зусім новай школы. З другога боку, і маскоўскія пісьменнікі, родам беларусы, прыйшлі на сваю ніву і сталі рабіць тое, што ўжо даўно рабілі польскія пісьменнікі – родам беларусы; яны сталі працаваць над беларусазнаўствам, між іншым, сваёй этнаграфічнай, філалагічнай, гістарычнай і падобнай работаю тварыць збіральны час у гісторыі роднай літаратуры"* (3, с. 239).




У Маскве Брайцаў знаёміцца з многімі рускімі пісьменнікамі, у тым ліку з **Л.М. Талстым,** які аказаў пэўны ўплыў на фарміраванне яго філасофскіх поглядаў. Вынікам знаёмства стала напісанне ў **1889 г.** псіхалагічнага эцюда **"Юда"**. У маскоўскі перыяд ён актыўна займаецца літаратурнай творчасцю, да таго ж зарабляе неблагія грошы, каб забяспечыць сям'ю, у якой падрасталі ўжо трое

*Псіхалагічны эцюд "Юда". Аўтограф. 1899 г.*

*Браты Я. Брайцава:*
*Іван Раманавіч з жонкай Наталляй Дзмітрыеўнай. Масква. 1900 г.; Васіль Раманавіч. Масква. 1960 г.*





сыноў. У гэты ж час вельмі добрую матэрыяльную падтрымку ад яго маюць малодшыя браты Брайцавы – Іван і Васіль, якім ён дапамагае атрымаць вышэйшую адукацыю. Пазней **Іван Раманавіч** стаў выдатным матэматыкам, доктарам фізіка-матэматычных навук, а **Васіль Раманавіч** – вядомым хірургам, прафесарам.

Брайцаў шукаў розныя спосабы матэрыяльнага забяспечэння сям'і, у тым ліку займаўся адвакацкай практыкай. Засвоіўшы асновы прадпрымальніцкай дзейнасці ў купца Ноева, ён адкрывае прыватную краму кветак. Але тут яго пільнавала няўдача. Па нейкіх прычынах ён абанкручваецца і губляе ўсе грошы, назапашаныя цяжкімі высілкамі папярэдніх гадоў. З-за немагчымасці аплаціць выдаткі за выданне друкарня спыняе працу па набору чарговай кнігі Брайцава. Усё гэта надоўга выбівае яго з творчай каляіны і знішчае маральна. У гэты час у Забялышыне памірае бацька, і жонка пісьменніка **Праскоўя Сяргееўна** ўгаворвае хворага мужа вярнуцца ў родны дом.

З **1900 г.** Брайцаў ізноў на радзіме, але праз дваццаць гадоў гарадскога жыцця сельскія клопаты даюцца яму з цяжкасцю і ён вырашае заняцца адвакацкай дзейнасцю. У хуткім часе пісьменнік становіцца вельмі папулярным чалавекам на Магілёўшчыне: яму нейкім цудам удаецца, абараняючы правы забітых і цёмных сялян, выйграваць справы па зямельных і маёмасных пытаннях. Як заўважае **Ф. Дамінікоўскі,** "*... в нём оказался отличный ораторский талант и способ-*

*ность к выявлению самых запутанных дел. Яков Романович сделался бескорыстным и беззаветным ходатаем за обездоленных бедняков"* (I, с. 5). У **1902 г.** пасля нараджэння чацвёртага сына Васіля (менавіта ён паклапаціўся за архіў бацькі) памерла жонка пісьменніка, і клопат па догляду за хлопчыкам лёг на плечы бацькі. Да сямейных праблем далучыліся і сацыяльна-грамадскія: Брайцаў, які заўсёды крытычна ставіўся да існуючага ладу жыцця, разам з аднавяскоўцамі ўдзельнічае ў стыхійным рэвалюцыйна-дэмакратычным руху пачатку XX ст. У **1905 г.**, пасля неаднаразовых вобыскаў па падазрэнні ў захоўванні нелегальнай літаратуры, ён трапляе пад нагляд паліцыі. Падзеі, якія адбываліся пасля паразы першай рускай рэвалюцыі на Магілёўшчыне, знайшлі адлюстраванне ў яго рамане **"Паміж балот і лясоў"**, напісаным у **1913–1916 гг.** Галоўны герой твора **Аляксандр Савіцкі** з'яўляецца рэальнай асобай. "Беларускі Робін Гуд" стварыў баявы партызанскі атрад для барацьбы з багацеямі і прыгнятальнікамі, якую ён уяўляў вельмі па-свойму. Аўтар рамана стварыў вобраз высакароднага, справядлівага, мужнага заступніка за правы простага чалавека. На працягу 1907–1908 гг. удзельнікі атрада рабавалі багатыя маёнткі і раздавалі бедным грошы, жывёлу, маёмасць, часта ўступаючы ва ўзброенныя сутычкі з прадстаўнікамі ўлады. Біёграф пісьменніка **Ф.М. Дамінікоўскі** сцвярджаў: *"Идея снова зажечь пламя революции, поднять массы на открытую борьбу с правительством в то время была нереальной, тактика партизанской вооруженной борьбы с целью поднять революционное восстание была ошибочной. Но отдельные руководители этого движения своим беззаветным и бескорыстным служением идее свержения царского гнета, своей смертью во имя свободы в годы тяжелого безвременья оставили по себе в народе добрую память. К числу таких героев следует отнести и сына белорусского народа А.И. Савицкого"* (1, с. 20).

Пра вышэйшую справядлівасць для сябе і свайго народа марыў у сваім жыцці і аўтар рамана Якуб Брайцаў. Усе пасады, якія ён займаў на радзіме пасля **Кастрычніцкай рэвалюцыі**, пра гэта сведчаць. Пачынаючы з **лютага 1917 г.**, ён працуе спачатку сакратаром Забялышынскага валаснога выканкама, потым Клімавіцкага павятовага выканкама, нейкі час – пракурорам Клімавіцкага павета. У **1920–1922 гг.** становіцца сябрам калегіі Клімавіцкага павятовага аддзела сацыяльнай абароны, а потым зямельнага аддзела. Апошнія гады жыцця ён працаваў у сельсавеце роднай вёскі, чытаў курс земляробства ў Забялышынскай школе сялянскай моладзі.

У **другой палове 1920-х гг.** Брайцаў ізноў вяртаецца да літаратурнай творчасці. Піша вялікую аповесць **"Гаспадар"**, фотакопія рукапісу якой паступіла ў **БДАМЛІМ з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва СССР**, актыўна супрацоўнічае з маскоўскай "Крестьянской газетой", куды дасылае свае вершы, аб чым сведчыць адзіны захаваны **ліст да сына Васіля** (4, с.1 адв.). У гэты ж час становіцца сябрам Усерасійскага саюза сялянскіх пісьменнікаў.

Памёр Якуб Брайцаў **2 сакавіка 1931 г.** і пахаваны на могілках роднай вёскі **Забялышын**. Па сведчанні паэта **Алеся Пісьмянкова** (5, с.14–15), які наведаў могілкі ў канцы 1990-х гг., аднавяскоўцы з вялікай цеплынёй узгадваюць *"прыгожага чалавека"* і старанна даглядаюць магілу паважанага земляка.

Творчасць "нявыдадзенага" пісьменніка Якуба Брайцава займае пэўнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. Савецкія літаратуразнаўцы адзначылі ўклад яго твораў ў паказе *"пранікнення капіталізму ў беларускую вёску, паяўлення кулацтва, сельскай буржуазіі"* (**В. Хромчанка**) (6, с. 19) і зрабілі выснову, што *"руска-беларускія творы другой палавіны XIX ст. складалі літаратуру, якая давала рускаму грамадству веды пра Беларусь і пра беларускі народ, веды ўжо не толькі этнаграфічныя, але*

*таксама сацыяльна-бытавыя і сацыяльна-псіхалагічныя... Не маючы непасрэднай сувязі з беларускай літаратурай, руска-беларускія пісьменнікі, пішучы, у асноўным для рускага чытача, стваралі ў літаратурным і культурным жыцці беларускага краю атмасферу зацікаўленасці да штодзённага народнага жыцця, да яго тыповых нацыянальных прыкмет. Прычым служэнне нацыянальным інтарэсам беларускага народа ў іх было свядомае і мэтанакіраванае, што відаць як з ідэйна-вобразнага зместу твораў, так і з публіцыстычных адступленняў"* (**В. Каваленка**) (7, с. 174, 178).

Сучасныя даследчыкі, напрыклад, **А.І. Белая**, дацэнт кафедры філалогіі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, звяртаючыся да рамана "Паміж балот і лясоў", аналізуе вобраз галоўнага героя як *"чалавека свабоднага"*, параўноўваючы Аляксандра Савіцкага з Уладзімірам Дуброўскім А.С. Пушкіна, а таксама, на прыкладзе гэтага рамана, разглядае этнаграфізм як рысу эстэтычнай свядомасці пісьменнікаў XX ст.

Як бачым, унікальная рукапісная спадчына Якуба Брайцава заслугоўвае быць выдадзенай. Пра гэта марыў і сын пісьменніка, калі ў **1961 г.** звяртаўся з лістом да старшыні Саюза пісьменнікаў БССР **Петруся Броўкі** з просьбай выдаць да стогадовага юбілею творы бацькі. Пра гэта мараць і архівісты: падрыхтаваны **Г.В. Запартыкай** да выдання важкі том твораў пісьменніка чакае свайго часу і выдаўца.

У лютым гэтага года было адсвяткавана **150-годдзе** з дня нараджэння Якуба Брайцава. **"Забыты пісьменнік"** – так назвалі ў БДАМЛМ выставу, ство-



*Таіса Трухіна і Клара Жорава з сынам Брайцава Васілём у час прыезду ў Мінск для перадачы архіва бацькі ў ЦДАЛМ. Май 1961 г.*

рануую на аснове ўнікальных дакументаў з фонда пісьменніка канца XIX – пачатку XX ст. На адкрыцці выставы **Г.В. Запартыка** і **А.І. Белая**, распавядаючы пра яго жыццё і творчасць, яшчэ раз падкрэслілі: не павінна заставацца белых плям у гісторыі беларускай літаратуры, а дакументы, якія захоўваюцца ў асабістых архівах яе выдатных прадстаўнікоў, павінны служыць вялікім задачам.

### Літаратура:

Доминиковский Ф.Н. Белоруссия в произведениях Я.Р. Брайцева. 1948

Машынапіс з нязначнымі праўкамі. Ф. 7. Воп. 1. Адз. зах. 27. Лл. 1–27.

Карский Е. Белорусы. Том III. Очерки словесности белорусского племени. – Петроград: 1922.

Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі // Уклад. і падрыхт. тэксту Т. Голуб. – Мінск: Маст.літ., 1992.

Ліст Я. Брайцава да сям'і сына Васіля. 30 верасня 1928 г. Ф. 7. Воп. 1. Адз.зах. 14. Лл. 1–1 адв.

Пісьмянкоў А. Забыты Брайцаў. // Літаратура і мастацтва. 26 лютага 1999 г.

Хромчанка К.Р. Беларуская мастацкая проза. Канец XIX – пачатак XX стст. – Мінск: выдавецтва БДУ імя У.І.Леніна, 1979.

Каваленка В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў. – Мінск: выдавецтва "Навука і тэхніка", 1975.

---

[1] Брайцаў Васіль Якубавіч (1902–1968) – хірург, прафесар. Быў галоўным урачом Крамлёўскай бальніцы.

[2] Дамінікоўскі Фёдар Мікалаевіч (1905–1949) – беларускі гісторык, бібліёграф, прыродазнаўца.

***Таццяна Кекелева***
*загадчык аддзела інфармацыі, публікацыі*
*і навуковага выкарыстання дпеументаў БДАМЛМ*

Кекелева, Т. Якуб Раманавіч Брайцаў : сустрэча з забытым пісьменнікам : [пра ураджэнца Хоцімскага раёна] / Таццяна Кекелева // Архівы і справаводства. — 2011. — № 5. — С. 91—99.